МУЗЕЙ Р.К.К.А.
Кн/1543
Июль 1934 г.

Вольная Беларусь

Цэна асобнага № 25 кап.

Умовы надпіскі на 1917 год.

За 1 м	За 2 м	За 3 м	За 4 м	За 5 м	За 6 м	За 7 м	За 8 м	За 9 м.
1 р.	2 р.	3 р.	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Надпіска прымаецца толькі с 1-го чысла кожнаго месяца.

Перамена адрэсу 50 кап. Пры зьмені адрэсу конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска перапісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ні будуць.

На ліставанне, перасылку рукапісау і іншыя адказы—павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эконамічная і літэратурная.

ГОД ВЫДАННЯ I.

Адрэс рэданцыі і адміністрацыі: Мінск, Захарауск. 18.

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы—1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 36 1917 г. Нядзеля 31 сьнежня 1917 г. № 36

Прымасцца падпіска на палітычную, эконамічную і літэратурную газэту

„Вольная Беларусь"

З Новаго Году газэта будзе выходзіць журналам на 8 страніц вялікаго формату. С прычыны дарагоўлі і нiхвату паперы газэта мае друкавацца с такім рахункам, каб здаволіць запатрэбованні падпісчыкаў. Дзеля таго, хто хоча адтрымліваць у 1918 г. нашае выданне, той павінен надпісацца загодзе, або паведоміць аб гэтым лістоўне. На праціўны выпадак, баженне надпішчыка ні будзе споўнено за нідахватам лішніх экзэмпляроў.

У 1918 г. будуць друкавацца гэтакія рэчы с прыгожаю пісьменства: **„Сымон Музыка"** (ч. III, IV і V) і **„Новая Зямля"** *Якуба Коласа,* **Аповеданні** *Тараса Гушчы;* **„Маці"**, **„Генэрал"**, з романа **„Крыж"**, **„Па чыстай адстаўцы"** *Максіма Горэцкаго;* **„Аповеданне без назвы"** *Язэпа Лесіка;* пьеса **„Ні розумам сьцяміў, а сэрцам"** *К. Вяселаго* і шмат дробных аповеданняў і вершаў розных беларускіх пісьменнікаў.

Подпісная цана: на год—**12** рб., на поўгода—**7** рб., на 1 м-ц—**1** рб. **50** кап. На іншы тэрмін надпіска ні прымаецца.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **г. Мінск, Захароўск., 18. Тэлефон 776.**

«ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ» выйдзе у 1917 г. у ліку 36 нумароу. У 1918 г. «Вольная Беларусь» стане выдавацца журналам вялікаго формату на 8 стр. і с першых нумароу, апрач зазначанага у абвестцы, пачнуцца друкам: пьеса Алеся Гаруна «КАРА», «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ» у перыод с VIII—XIII сталецця П. Нечыпорэнкі, «ГАБРЫЭЛЕВЫ АЛЛЕІ» М. Горэцнаго і «МАЦІ, МУЗА і ПАЭТА» Цішкі Гартнаго.

Тры сьцежкі.

Тры сьцежкі па нашай зямельцы пра-
(ходзюць,—
Тры сьцежкі.
Адна па Заход—да Варшавы.
Другая па Усход—да Масквы.
А трэйцяя—проста упярод,
Ідзе, ды ідзе, ды ідзе —
Далека—да самаго Сонца,—
Тры сьцежкі.

* * *

Тры варты на сьцежках стаяць і чакаюць,--
Тры варты.
Адна уся у чорных сутанах лацінкау,
І хітры-зьмяіны язык езуітау
Усіх кліча-заве да готыцкіх харомау,
У рукі паном цалаваць.
Другая уся у залатых позумэнтах.
І грубаю голаснай лаянкай кліча,
Кулак яе сьцісьнуты. Біцца гатова.
Ганяе усіх пад цар-звон на паклон.
А трэйцяя варта у сьвітках, у белых,
У поясах тканых рукамі сялянак—
Усе у васількох ды у макавых кветках.
Бароды сівыя да самых грудзей,
І вочы зіяюць, бы зоркі.
Нічога ні кажуць, а граюць на гусьлях,
У сьпевах бяз слоу уся відаць Беларусь:
Шчыр-боры шумяць і жауронкі сьпеваюць.
Хвалююцца рэчкі. Ратаі аруць.
І чуецца горо нішчэснай зямелькі,
І чуюцца сьлезы бяздольнай Краіны.
І граюць на гусьлях. І сьпевы бяз слоу
Ой, дужа гаворуць, чаруюць душу.

* * *

Ідзі, беларус, толькі сьцежкай свае!!
Сьцежкай сваею
Да Сонца ідзі!

Мінск 27/XII—1917 г. *Ясакар.*

Завіруха.

Завіруха скача ноччу
Натарочай, плача, вые:
Пухавыя сыпе у вочы
Сьнегавінкі мне; рагоча.
Йду на вобмацк; ледзь жывы я
Ніжывыя суну ногі,
— Без дарогі. Цело ныя,
Калянея; верставы я
Праміпаю слуп, убогі
Троярогі крыж збутвелы,
Насівелы, цёмны, строгі.
Ні чакаю дапамогі...
Прыступае нехта белы
— Асьмялелы, вот усьцігае,
Акаляе, скамянелы,
Насінелы,—абнімае.
Завіруха —
Рагатуха сыпе сьнегу
І у прабегу шэпча у вуха:
«Зaнaчуеш—ні пачуеш:
«Я завею, я угрэю,
«Зараз ляжаш, дзякуй скажаш,
«Мне ты скажаш.» Завіруха—
Рагатуха—шэпча у вуха.

Ажно чую: раптам злая
Улягае, уціхае
Завіруха. Замірае.
Праясьняе у полі. Нікне
А ні-зыкне вецяр-сватка.
Бачу хатка
— Як тры зоркі тры ваконцы—
Пры гасьцінцу. Верацёнцы
Дыму у неба уюцца, пнуцца,
— Хатка, вокны, дым, сьмяюцца,
Клічуць, вабяць, сустрэчаюць
Прывечаюць, запрашаюць,
Голас чую родных, мілых.
Узмацаваушыся на сілах
Крыкнуць рады «згінь ты горо!»
А яно у атказ гаворэ:
— «Над табою
Сьнег гурбою.»

1914 г. Сыбір. *А. Гарун.*

Грамадзяне!

Абяздолены і пакрыуджаны векамі беларускі народ абудзіуся ад векавога гора, сьлез і пакуты, разагнуу сваю сьпіну, выпрастау скованыя плечы і пачау сам будаваць сваю хату, каваць сваю сьветлую, вольную будучыну. Але ворагі волі, гвалтаунікі і прыгоннічыкі ні даюць пакутнаму беларускаму народу выявіць сваю волю і будаваць свае жыцце так, як яму жадаецца. Вялікі абраз уваскрошаючаго народу устрывожыу асінае гьяздо ворагау беларускага народу і так званых «камісарау Заходняй бласьці», захапіушых уласьць у краю, нічога супольнаго ні маючыя з Беларусьсю, ні зацікауленыя яе доляй, яны падпялі безсаромліва руку на вольных сыноу Беларусі—салдат, селян і рабочых ад усяго краю—якія сабраліся на Усебеларускі Зьезд у г. Мінску. Яны прывелі узброеную сілу, арыштавалі прэзыдыум зьезду і шмат каго з яго відных членау і шкодзяць дальнейшай працы зьезду.

Грамадзяне! Рушыцца сьвятое права беларускаго народу па самавызначэнне; гіне заваеваная Расійскай Рэвалюцыяй воля! Выяуляючы свой протэст проціу гвалту над беларускім народам, клічам усіх, каму дарагая воля, каму дарагая сьветлая будучына Беларусі,—злучыцца цесьней увакруг беларускіх пролетарскіх арганізацыяу і агульнымі стараннямі даць адпор усім гвалтоунікам і намоузьліуцам, акія хочуць адняць у нашаго народу яго права самому выраіныць сваю долю у цяперашні трагічны для Беларусі момэнт. Злучыушыся у свае нацыянальныя арганізацыі, беларускі народ ні пазволіць розным цемным, нівядомым асобам кіраваць яго доляй, а сам сабе працярэбіць шлях да волі, роунасьці і брацтва!

Далоу гвалтоунікау—ворагоу волі, ворагоу працоунаго беларускаго народу!

Ніхай жыве Вольная Беларусь!

Выканаучы Камітэт воіноу-беларусау Пауночнаго Фронту.
Вітэбскі Камітэт Беларускай Соцыялістычнай Грамады.

Усебеларускі зьезд.

(Агляд).

Зьезд адчыніуся у мінскім горадзкім тэатры 5-го сьнежня. А гадзіні 7-й у вечар началі надыходзіць дэпутаты. Большасьць салдат у шэрых шынелях, а так сама многа селян у кажушках с клункамі у руках, або за плячыма. Хутка тэатр напоуняецца. Многа гасьцей і цікавых. Штацкіх мала. Адзін, два, тры,- і то хто небудзь с членау Вялікае Рады...

Усіх хвалюе думка, што скажа зьезд, у во што выльецца гэтае моро галасоу? Што пачуе ад яго родная старонка? Па якому шляху павядзе ен спакутны край? Але усе пэуны, што с пастановамі зьезду прымушаны будуць лічыцца і Польша, і Літва, і Гэрманія, і што да голасу яго прыслухіваецца і Украіна.

Пападаюцца і ворагі беларушчыны. Туляючысь па цемных кутках, яны вядуць агітацыю проці зьезду, проці Вялікае Рады і беларускаго руху. Чуюцца усім абрыдлыя словы аб польскай інтрызі, аб патрыманні руху панскімі грашыма і аб тым, што соцыялістычная грамада на повадзі у князеу. Але агітацыя усьпеху ні мае. Адны сьмяюцца, другія адмахваюцца, як ад назолау, а дзе—хто сярод салдат пагражае агітаторам арэштам за пашырэнне цемных чутак. Гэта памагае. Агітаторы змоукаюць і хаваюцца у гушчы.

А 7-і с паловаю гадзіні старшыня Выканаучаго Камітэту Цэнт. Вайсковае Рады, С. Рак-Міхайлоускі, ад імені бюро па склікапню зьезду, абвешчае, што правамоцных дэпутатау покі што 300 чалавек, рэшта—або з дарадчым голасам, або госьці. Усіх дэпутатау павінно быць 900 чалавек. А таму, прапануецца тым часам адчыніць толькі параду, покі зьедуцца усе дэлегаты зьезду, або зьбярэцца правамоцны лік яго.

Прапазыцыя прымаецца, выбіраецца Рада старшын і чытаецца навестка зьезду. Парадак дня гэтакі: 1) *Цяперашняе палітычнае становішчо і лес Беларусі.* а) Вайна і мір, міжнароднае становішчо Беларусі. б) Становішчо Расіі. (Дакладчыкі—Я. Варонка і Гольман). в) Нацыянальная цэльнасьць Беларускаго народу і яго самаадзначэнне. (Докладчыкі—проф. Е. Карскі, Я. Лесік і Канчар).

2) *Унутранае становішчо Беларусі.* а) Эконамічная разруха і адноуленне гаспадар. і эконамічнаго жыцця краю. (Дакладчыкі—А. Уласау, В. Іваноускі). б) Вырашэнне зямельнаго пытання: 1) перадача зямлі працоунаму народу: 2) формы карыстання зямлею: 3) інтэнсіфікацыя сельскае гаспадаркі у зьвязку з вырашэннем зямельнаго чытання. (Дакладчыкі—А. Смоліч і Канчар). в) Бежэнскае пытанне. (Дакладчыкі—Э. Будзька і Цьвікевіч). г) Інвалiднае пытанне. (Дакладчыца – П. Бадунова). д) Адноуленне зруйнованых вайною селянскіх гаспадарак краю. (Дакладчыкі—Э. Будзька, Архангельскі, Пліс, Гадыцкі-Цьвірка). е) Адноуленне нарушанаго грамад.-культурнаго жыцця у краю: чарговыя пытанні па народнай прасьвеці на Беларусі. (Докладчыкі—Доугялла, Ігнатоускі).

3). *Аутаномія Беларусі* і фэдэрацыйны лад Расійскай Рэспублікі. Правы і вольнасьці Беларускаго народу і нацыянальных меньшасьцяу краю. (Дакладчыкі—Я. Варонка, А. Цьвікевіч, Мэнч).

4) *Арганізацыя тымчасовай краевае уласьці.* а) Прэдстауніцкі краевы орган; б) Выканауча-адміністрацыйны орган. в) Судовы краевы орган. (Дакладчыкі—Я. Варонка, Пэузнер, Ярэміч).

5) *Фінансы Беларусі.* (Дакладчык А. Уласау.)

6) *Арганізацыя Беларускай нацыянальнай арміі.* Дакладчыкі—ген. Кондратовіч, С. Рак-Міхайлоускі).

7) *Краіовы Установчы сойм Беларусі.* (Дакладчыкі—Я. Дыла, А. Бурбіс, Я. Варонка).

Прымаецца прапазыцыя паставіць, як асобны пункт, пытанне аб каопэрацыі і у першую чаргу адносіны беларусау да украінцау, палякоу і літоуцау у зьвязку с перажываемым момэнтам.

Зьезд пастаноулено раздзеліць на 8 сэкцыяу: 1) Палітычна-нацыянальную, 2) Аграрную, 3) Эконамічна-фінансовую, 4) Культурна-прасьветную, 5) Па справам арганізацыі тымчасовай уласьці, 6) Дзяржауна-прауную, 7) Па справам арганізацыі арміі і 8) Бежэнскую і па справам апекі.

7-го сьнежня, посьля доугіх спрэчак, пастаноулено зьезд лічыць правамоцным, ні гледзючы на тое, што ні усе яшчэ дэпутаты зьехаліся. Усе згадзіліся на том, што родзіна ні можа чакаць. Настау грозны час, Беларусь просіць абароны. «Калі мы ціпер і памылімся у чым-колечы, —кажа адзін прамоуца, дык наш Беларускі Устаноучы Сойм выправіць нашыя памылкі і напіша законы для нашаго краю.» «Калі большэвікі без зьезду забралі уласьць, то чаму мы на зьездзі ні можам абвесьціць уласьць», зауважвае другі. Ген. Алексеяускі просіць слова і кажа, што мы адсталі ад украінцау, але ні трэба забываць, што часам апошнія робяцца першымі.

Зьезд прызнаецца правамоцным. Тэатр напоуняецца гучнымі воклікамі: «Ніхай жыве Беларуская Народная Рэспубліка!»—«Ніхай жыве Беларуская армія!»

С. Рак-Міхайлоускі адчынае зьезд прамоваю: «Народ Беларускі! На маю долю выпау вялікі гонар адчыніць гэты зьезд. Праз вашыя плечы я бачу усю Беларусь. Вы прышлі сказаць свае слово. Працуйце-ж на карысьць свайго народу! Ніхай жыве вольная Беларусь!»

Ваенны аркестр зайграу марсельезу. «Ніхай Жыве Беларуская Рэспубліка!» гучна разносіцца па тэатру. Беларускі хор сьпевае беларускую марсельезу «Ад веку мы спалі», гымн „А хто там ідзе?" і другія рэвалюцыйныя песьні. Пачынаюцца прывітанні, с пачатку ад беларускіх арганізацыяу, а потым ад іншых нацыянальнасьцяу. Цікава зазначыць прывітанне ад салдатау украінцау заходн. фронту,—прывітанне, зьвязанае с конфліктам паміж Укр. Цэнт. Радаю і большэвіцкім урадам, абвесьціушым вайну Украіні. «Беларускі народ!—сказау украінскі прэдстаунік: «Мы тры годы разам с табою вядом вайну. Вашае горо было нашым горам і вашае шчасьце—нашае шчасьце. Над намі ціпер падвялі меч. Мы маем право сказаць: ні лезь у нашую хату! Гурток людзей ідзе проці нас. Ні магу я ні падзяліцца з вамі сваім горам. Дэмакратыя абвесьціла лозунг «самаодзначэння», а ціпер ні дае нам самым самавызначыцца. Нас прымушаюць прыняць большэвіцкое «самавызначэнне.» Нам абвесьцілі вайну. Тры украінцы фронтовага камітэту у Мінску арыштованы. Як цяжка, што на вашай зямлі, у вольнай Беларусі, нас арыштовываюць! (Крыкі: «аслабаніць, аслабаніць!» Гучныя апло-

дысмэнты пераходзяць у грандзіозную авацыю).

Прывітанні цягнуліся і на заўтра да поўдня. Посьля выбароў прэзыдыума пачынаюць чытаць даклады. Першым прачытаў даклад «Па зямельнаму пытанню» стары народаволец А. Я. Бонч-Осмалоўскі. Яго стрэчаюць і праважаюць апплёдысмэнтамі.

Дакладчык разглядае зямельнае пытанне на Беларусі так, як гэта робяць расійскія соц-рэвалюцыянэры. На яго думку, *уравнительное землепользованіе* развяжа зямельнае пытанне і дасягне справядлівасьці. Агрыкультуру можна развіваць праз кнігі, лекцыі, газэты, абмінаючы прыватную, асобістую ініцыятыву у гэтым сэнсі. Там, дзе селяне прывыклі да індывідуальнага гаспадарства, можна заводзіць хутары па 4 і больш хутароў разам і, у разі чаго, зноў рабіць перадзелы.

Разгон Усебеларускаго зьезду.

17 сьнежня, у вечары, адбыўся агульны сход дэлегатаў Усебеларускаго Зьезду у Беларускім Нацыянальным Доме (бышае Дворянское Сабранне). На чарзе дня стаяло пытанне аб краёвай уласьці.

У большасьці рэзалюцый вымагалося абвесьціць Беларусь аўтономнай Рэспублікай. Была, праўда, нівялікая кучка людзей праціўнікаў Беларускай Рэспублікі. Але удалося злавіць паміж іх некольні правакатараў с фальшывымі дакумэнтамі. Іх падаслалі ворагі беларускаго руху, каб шкодзіць справе. Агульны настрой быў вельмі падняты. Усе дэлегаты Зьезду выказалі натрэбнасьць вырашыць долю Беларусі ні чэкаючы,—зараз-жа. З розных кутоў вялікай залі раздаваліся радасныя выклікі:

«Ніхай жыве Беларуская Рэспубліка!»

«Ніхай жыве вольны Беларускі Народ!»

Каля 3 гадзіны у ночы Рада Зьезду скончыла сваю работу. Старшыня пачаў чытаць апрацованую Радай рэзалюцыю. У гэты момант падышлі да стала прэзыдыума два салдаты і назвалі себе: першы—«камісарам западной области», а другі—«начальнікам гарнізону», сказалі, што прышлі арыштаваць прэзыдыум і разагнаць Зьезд.

Тады, пры іх жа, старшыня Зьезду агласіў першы пункт рэзалюцыі, дзе Беларусь апавешчаецца Рэспублікай. Бадай што увесь Зьезд аднастайне зацьвярдзіў гэты пункт.

— Таварышы, наш дом акружоны войскам! каля яго стаяць кулямёты і броневікі!— пачуўся раптам аднекуль голас.

У залі падняўся шум. Тады зьвярнуўся да Зьезду с прамовай «начальнік гарнізону» Крывошэін.

Хістаючыся на нагах, крэпка выпіўшы, ён пачаў гаварыць. Але праз шум спачатку нельга было нічога разабраць. Толькі потым, як троху пацішэло, пачуліся бессьвязныя фразы «начальніка», каторы гаварыў аб нейкіх «лайковых перчатках.» Кончыў ён сваю білібэрду вось як: «А теперь я распускаю ваше собраніе!»

Пры гэтых словах у залю ўвайшлі ўзброеныя салдаты.

Агульнымі сіламі іх выціснулі за дзьверы і, посьля згукаў марсельезы, нехта голасна казаў:

— «Браты беларусы! Мы бачылі жандармаў Мікалая II, але сягоння мы убачылі жандармаў у свабоднай рэвалюцыйнай старане, пад маскай большэвіцкіх камісараў, на вольным зьездзі вольнаго народу!»

Зноў уварваліся салдаты, разбіраючы барыкады с крэслаў і зэдлікаў, накіданыя дэлегатамі зьезду—селянамі і салдатамі.

Пад сьпевы жалобнаго маршу, выводзілі арыштованы прэдзыдыум і шмат каго з відных працаўнікоў зьезду. Арэшт цягнуўся усю ноч. Прыклады працавалі направа і налева. Паволі пусьцела вялікая заля. Гаслі лямпы. А у цёмным кутку сядзеў адзінока сівы дзед—селянін. Плечы яго ўздрыгалі. Ен плакаў, як дзіця.

На заўтрае у ночы, а 4 гадзіні, разагналі і Вайсковую Беларускую Раду, будзячы членаў не штыкамі.

* * *

Абураныя, з вялікім гневам у душы, разъехаліся дэлегаты Усебеларускаго Зьезду, селяне і салдаты, ва усе волосьці, ва усе гарады, ва усе фронты, ва усе воінскія часьці. І болей тысячы чалавек дэлегатоў зьезду будзе апавядаць усім аб «самовызначэнні» беларускаго народу большэвіцкімі штыкамі.

Гэта ганебная вестка разнесецца-разляцелася па усей Расіі, выклікаючы ва усіх гарачыя пратэсты проці большэвіцкаго рэжыму.

Гэты акт зьдзеку над беларускім народам, учынены праз наплыўны элемэнт гвалтоўнікоў—чужынцаў, моцна углыбіцца у душы кожнаго чэлавека, пакутаваўшаго за Волю. І усе зразумеюць, што гэтакімі сваімі дзеямі большэвікі самі капаюць сабе дол. А ганьба ім астанецца на векі!

Посьля гэтаго кожны шчыры беларус яшчэ з большай энэргіяй, з большым агнём будзе працаваць на карысьць пакутнай маці-Беларусі, ні пакладаючы рук, ведаючы, што трэба самім аб сабе дбаць.

Ніхай жыве Беларуская Рэспубліка!

Ніхай жыве Вольны Беларускі Народ!

Дэлегат Зьезду *І. Нелепко.*

Кароткі фэльетон.

Перад Новым Годам.

Канцэлярыя у пеклі. Ляскаюць шчоты. Скрыпяць перы. Чарцюгі рыюцца у розных пузатых кнігах. Дапісываюць і адпісываюць. Адпісываюць і дапісываюць.

Пад загадом самога князя пекла, Люцыпара, яны робюць падрахункі сваім дзеям за 1917 год і рыхтуюць праэкты на 1918 год.

Але раптам, у самым разгары работы, убегаіць лёкай, чорт Азазэль, і кажа, што сама пані Сваволя прышла з дакладам.

— Просімо, просімо!—прыемным басам, па джэнтльмэнску, кажа Люцыпар, —з ахвотаю паслухаем таварыша Сваволю. Мы чэкаемо! І Люцыпар галантна пакруціў хвастом.

Увайшла і пакланілася страшная ведзьма, Сваволя. Гарбатая, з доўгім сінім носам, с чырвонымі вачыма, з доўгімі касьцістымі рукамі, с пазурамі вострымі на пальцах, уся у гідкіх анучах—яна ні вельмі вабіла воко. Самы заядлы Бэк і то словам «буржуйка» ні адважыўся-б яе сароміць.

Але у пеклі яна была самай жычлівай цёткай-кумою.

— Ні бойцеся, ні палохайцеся,—кажа яна гідкім, замагільным голасам,—я сваю справу уладзіла так, як і лепей ні трэба. Німа ужо Волі на сьвеці! Яна сядзіць у мяне, як сучка на ланцугу. Рот анучамі заткнуты, каб і ні піскнула навят. Я, Сваволя, паную цяпер, як і панавала даўней.

— Браво, таварыш, браво—крычаць чэрці з усіх бакоў, на розныя галасы, на розныя лады.

— Калі Воля пачала рухацца,—кажа далей Сваволя, я троху занінакоілася. Яна, Воля, вырвалася ніўспадзеўкі з маіх ланцугоў і задумала парадкі рабіць. Але я хутка яе цапнула у свае лапы і уся яе справа пайшла шурам-бурам. І я заварыла людзям такую кашу, што вышло цэлое Вавілёнское столпатварэнне. Я пачала помпаваць натоўпы людзей рознымі ідэямі. Людзі ні могуць іх пераварыць і пачынаюць рыгаць імі направа і налева, як тыя сьвінні перакормляныя.

Пры гэтых словах чэрці лопаюцца, аплёдыруючы, і высовываюць доўгія языкі з зьмяіннымі джаламі.

— Я напускаю на людзей залёнаго зьмія—кажа далей Сваволя хрыплым голасам,—людзі напіваюцца і паміраюць пры бочках, топяцца у гарэлцы, грабуюць, палюць ўсё і забіваюць брат брата.

— Чуць угледзюць чэлавека ні пьянаго, спакойнаго, у чыстых, людзкіх вопратках,—адразу мая гарачая хэўра крычыць на яго «Буржуй!» і раздзіраець яго на кавалкі.

Чэрці круцяць хвастамі і глушуць пекло оплескамі.

— Я людзям паказала, што такое Воля! І яны цяпер, зьвярьяцелыя, ніпрытомныя, дзікія,—тузгаюць адзін аднаго, пытлююць, аж люба глядзець!

Чэрці радасна падкідываюць Сваволю на тры вярсты у гору. Люцыпар з ёю цалуецца і пытае:

— А каго ты там, таварыш, покуль што на сваім мейсцы аставіла?

— Хі-хі-хі!—кажэ Сваволя,—Бэкаў!

— А чым яны сябе зарэкамандавалі?—зацікавіўся Люцыпар.

— Усім, тав. Глаўкапекл,—усім!—кажа Своволя.—Лічы па пальцах: ніволя слова, ніволя друку, «самавызначэнне народаў». Хі-хі,—«вызначаюць» украінцаў і беларусаў; і арэштовываюць цэлыя Рады, зьезды цэлых народаў і рэкамі разліваюць кроў па вуліцах. І льецца людзкая кроў разам з гарэлкай, хі-хі!

— Іхняе пекло лепшае за тваё, таварыш Глаўкапекл!

— Яны,—кажэ далей Сваволя,—уціскалі народ раней і цяпер. Яны штыкамі правялі свабоднае голасаванне у Устаноўчы Сойм і рознымі фальшамі і гвалтованнем праводзілі свае Бэкаўскія сьпіскі. А калі усё-ж такі аказаліся выбранымі народам і іншыя людзі, дык яны стараюцца разганяць Устаноўчы Сойм, хі-хі! Яны руйнуюць гарады, палюць вёскі, і нішчуць усё багацце сваімі дэкрэтамі.

— Хай жывуць Бэкаўскія дэкрэты! —гаркнуло усё пекло.

На залезной дарозі.

I.

Івась нікому ні зайздросьціу—можа затым, што ен быу яшчэ сусім малы і мала знау жыцце; толькі цяперашней сваей долі ні паменяу бы ен на долю панскаго сына, хоць сам Івась быу толькі сын будачніка.

Будка іх стаяла адна у полі, пры самінькім лесі, праз каторы так сьмела і размашыста пралегла залезная дарога. Нівялічкі дворык быу агароджан прыгожаю гарацьбою. Пад аконцам, каторае выходзіло у бок залезнай дарогі расьлі кветачкі, красавауся пышны мак, а з нівялічкай градкі выкідала цыбуля, як шчэціну, свае стройныя перы. У двара, каля самай будкі, замест стала, стаяу высокі, гладкі дубовы пень, з роуна абрэзаным верхам. У сьвяты дзянек, у харошую пагоду, семья будачніка піла тут гарбату. Высокі, разложысты дуб распасьціpау свае тоустыя лапы над дворыком будачніка, хаваючы яго зяленую травінку ад гарачаго сонейка. Івась гадавауся адзін. Апроч кур, пеуня і сабакі Жучка, у Івася ні было таварышоу. Затое ж хто, як ні Івась, знау хараство летняй раніцы у полі? Каму, як ні яму, былі вядомы ціхія шэпты старога лесу на заходзі сонца? Хто лепш яго разьбірау птушыную гаворку? І ласьня мала здаволення паслухаць, як крэхчуць жабы у зяленым балотцы? Сам Івась прызнавауся у сваім сэрцы, што такога прыгожаго кутка ні знойдзеш нідзе на сьвеці... А залезная дарога?..

Не,—каб пачуць усю поунату гэтаго хараства, гэтых чарау дарогі, што ідзе каля іх, то трэба бачыць яе на свае вочы, трэба палюбавацца ею у ясны веснавы, або летні дзянечак. Роуная, як струнка, доугая—вокам ні скінуць, разсекла яна лес сваім сьмелым махам на дзьве палавіны, і Бог Сьвяты ведае, куды яна дзяецца, выскачыушы з лесу. Івасю крэпка хацелося выбрацца у дарогу паглядзець, што знайходзіцца там, за лесом, над каторым заусягды віселя сіневатая смуга, толькі гэта ніяк яму ні удавалося. Прызнацца, ен трохі баяуся далека адыходзіцца ад дому. Была яшчэ адна прычына любіць залезную дарогу. Івась ніколі ні прапускау здарэння спатыкаць пасажырскі цягнік: колькі разоу добрыя людзі выкідалі Івасю праз вакно вагона то цукеркі, то пустыя бляшанкі, што у высокай меры радавало малога Івася і рабіло яго проста такі шчасьлівым.

Івась ні меу яшчэ свайго дзела і жыу вольна, як той воздух палеу, на каторым ен гадавауся. Часта бегау ен на залезную дарогу паглядзець, як яго бацька падмятае, чысьціць палатно дарогі, як пробуе, ці крэпка сядзяць на шрубах гайкі. Усе гэта цікавіло Івася, і ен так углыбляуся у бацькаву работу, што забывауся аб сваім носі.

— А на вошта ты падкручываеш гэтыя шрубы? —пытау Івась бацьку.

— А каб рэльсы мацней трымаліся,—адказывау бацька:— будуць скрэпляны дрэнна, цягнік можа сысьці з дарогі, зробіцца нішчасьце, людзі пагінуць.—

Івась зараз жа думау аб тым, які малюнак выяуляу бы сабою цягнік сышоушы, ні дай Божэ, з рэльсау. Скура яго шорхла, мурашкі бегалі па целі ад гэтых думак, і ен яшчэ пільней паглядау за тым, ці усе гайкі перапробаваны, а калі бачыу, што бацька мінау каторую, то зараз жа зьвяртау на гэта яго увагу.

— Іш ты, майстар дарожны,—гаварыу бацька і, каб зрабіць прыемнае сыну, пробавау гайку.

— Барані Божэ, каб ні ты, то было-б крушэнне, — жартавау бацька, а Івась думау, што гэта праўда, і ад радасьці ні памятау, на каторым ен сьвеці.

II.

Новае жыцце, новыя думкі прынесла с сабою вайна.

Івась ніяк ні мог растлумачыць сабе, што за рэч такая—вайна; толькі потым, па меры таго, як ен прыслухоувауся да гутаркі старшых, у ім зложыуся страшны вобраз вайны. Вайна, у думках Івася, нешта асобнае, нізалежнае ад волі людзкой. Гэта была страшная кабеціна, каторая бадзяецца па сьвеці, і дзе яна ступае, там робяцца пажары і разбурэнне страшное. Вакруг яе гінуць людзі, і рэчкамі цячэ чалавечая кроу. Гэтую лютую бабу-вайну выпусьцілі на сьвет нямцэ, за гэта нашы салдаты і ідуць на нямцоу. Перш ім трэба заваеваць сваіх супраціунікоу, а тагды ужо злавіць страшную кабеціну і заперці яе у такі глыбокі калодзіж, адкуль яна і ні вылязе. Тагды і настане на сьвеці спакой. Івась кожын дзень бачыу, як валілі адзін за другім цягнікі с салдатамі. Божэ мой! Адкуль яны толькі браліся? Загарэлыя, здаравецкія,—здавалося, ні ведалі яны ніколі ніякога гора і бяды: у кожным поязьдзі грымеу гармонік, вяселыя, дружныя зыкі песьняу заглушалі гук вагонных калес; крэпкія салдацкія ногі ніахвотна стаялі на мейсцы: то тут то там рыхталіся яны крутнуцца, разайсьціся у шаленыя заліхвацкія скокі, і толькі ніхватка прастору стрымоувалі іх парыванні. Усе гэтыя зьявы крэпка займалі Івася. Поезд с салдатамі удаляуся, меньшыуся і у канцы саусім прападау з вачэй далека у тым лесі, куды уцякала і сама залезная дарога. А Івась стаяу, і думкі-вобразы ціха снаваліся над яго маленькаю галоукай і калыхалі яго сэрцо яшчэ нівядомымі для Івася жаданнямі. Яму самому хацелося быць салдатам і ехаць у гэтую прыгожую, чароуную даліню, нівядомую, так моцна парываючую да сябе Івасеву душу. Бачыу Івась, як на доугіх пляцформах вязьлі страшныя гарматы на агромных калесах... Пазіраючы на усе гэта, Івась ні так баяуся вайны, і яна здавалася яму навят вяселаю.

— І куды яны едуць і едуць?— пытау Івась у бацькі.

— На вайну,— адказывау каротка бацька і уздыхау.

— А чаму іх так многа?

— Многа? і ворагоу многа, сынку.

— Ну, а што пачнуць там рабіць, як зыдуцца усе?

— Ваеваць будуць.

— А як будуць ваеваць?

— Як ваеваць будуць?— перапытау бацька і разьгінау сьпіну— ен чысьціу і падмятау палатно дарогі:— а вот: нямцэ і аустрыякі будуць націскаць на нашых, нашыя—на іх, пачнуць жарыць з гармат адны у другіх, з вінтовак і кулеметау і будуць усе сходзіцца, а як сойдуцца— будуць калоцца штыхамі — во гэтак!—

Раптам уляцеу лёкай Азазэль з радыотэлеграмай і дае Люцыпару. Люцыпар чытае:

«Ад Глаўкаверха да Глаўкапекла!

На Украіні льецца кроў. Разганяюць прыкладамі і штыхамі беларускія селянскія зьезды. Мае пьяныя Крышэнкі пакавываюць добрым людзям Волю у вастрогах. Троцкі мае выдаць дэкрэт аб новых гільётынах для людзкіх галоў.»

Чэрці выюць і рагочуць з радасьці, а Люцыпар дыктуе свайму сакрэтару радыотэлеграму:

«Ад Глаукапекла—Глаўкаверху. Дзякую за шчырую службу. Вы, Бэкі,—мае найлепшыя таварышы! абманываеце народ ні горш за бышага самадзержца Мікалая II.»

З. Бядуля.

Становішчо зямельнага пытання на Беларусі.

Цікава азнаеміцца с становішчам зямельнага пытання на Беларусі у цыфровых яго данных. «Беларуская Рада» падае гэтакія падрахункі:

У Віленшчыні пры двух мільёнах 21 тыс. насялення на 1914 г. селянство мело 2,279,000 дзес. зямлі; зямлі скарбовае, удзельнае, царкоўнае, гарадзкой было 366 тысч. дзесяцін і землеуласьніцкай, або панскае, 1,533 тысч. дзесяцін.

У Віцебшчыні пры 1,909 тыс. насялення на 1914 год лічылося: селянскае зямлі 1,593 тысч. дзес., казенных, або скарбовых, удзельных, царкоўных і падобных 326 тысч. дзесяцін.

У Гродзеншчыні. на 2,029 тысч. насялення селянскае зямлі—1,517 тысч. дзесяцін, скарбовае, удзельнае і падобнае 558 тысч. дзесц., а панскае 1,203 тысч. дзесяцін.

У Міншчыні (амаль ні 3 мільёны насялення) селянскае зямлі было 1,946 тысч. дзесц., скарбовае і іншае—810 тыс. дзесяцін, а панскае—5,257 тысч. дзесц.

У Магілеушчыні (2,358 тысяч насялення) селянскае зямлі—1,619 тысяч. дзесяцін, скарбовае—182 тысч. дзесц. і панскае—2,304 тысч. дзесяцін.

У Смаленшчыні (2,073 тысяч насялення) селянскае зямлі—1936 тысч. дзесяцін, скарбовае—191 тысч. дзесяцін і панскае—1,634 тысч. дзесяц. н.

Лес—багацтво нашага краю. І цікава азнаеміцца с плашчаю лясоу на Беларусі.

На Віленшчыні скарбовых лясоу —260 тысяч дзесяцін, удзельных—німа, панскіх—643 тысяч дзесяцін.

На Віцебшчыні скарбовых лясоу 165 тысяч дзесяцін, удзельных 8,154 дзесяцін, панскіх—840 тысяч дзесяцін.

На Гродзеншчыні скарбовых —277 тысяч дзесяцін, удзельных—116 тысяч дзесяцін і панскіх—334 тысячы дзесяцін.

На Міншчыні скарбовых лясоу—473 тысячы дзесяцін, удзельных—німа, панскіх 2,507 тысч. 700 дзесяцін.

На Магілеушчыні скарбовых—105 тысяч дзесяцін, удзельных—німа, панскіх—715 тысяч дзесяцін.

На Смаленшчыні скарбовых лясоу—85 тысяч дзесяцін, удзельных—німа, панскіх—997 тысяч. дзесяцін.

Лясоу спорных, або грамадзкіх, і селянскіх на Беларусі бадай што німа, апрач Магілеушчыны, дзе іх лічыцца 205 тысяч дзесяцін, і Смаленшчыны, дзе іх 138 тысяч дзесяцін.

Ад Рэдакцыі. «Вольная Беларусь» покі што едыная шчыра дэмократычная газэта з багатым аддзелам прыгожага пісьменства выдатнейшых нашых пісьменнікау.

Чытачы і прыхільнікі нашыя! Падтрымайце «Вольную Беларусь» падпіскаю, зборам ахвяр і пашырэннем беларускага друкованага слова. Гэта нашая едыная газэта, едыны сьветач на усю Беларусь. Цяжкі час прымушае нас зьвярнуцца за падпамогаю да усіх, хто спагадае росквіту беларускага друкованага слова. Народ ні можа жыць без кніжкі і свае газэты.

Дружна за працу! Да гэтаго заклікае нас званне **беларуса**. Хто дбае, той і мае! І нікай ні пачуем мы дакору, што ні маем свае газэты! Ушануем сябе ад гэтаго сораму!

Уселякія весткі.

Зялёны зьмей.

Ні гледзючы на асадние становішчо, у Петраградзі разгульвае зялёны зьмей. Рабуюць гарэлку і віно і страляюць па вуліцах.

Пагромы ідуць і у дзень і у ночы. Страляюць с кулямётау і с стрэльбау. Прысланыя дзеля усьмірэння салдаты нічога зрабіць ні могуць і так-сама далучаюцца да пьяной оргіі. Віно са склепау выносюць у кошыках і мешках. На дарозі іх перайімаюць другія да адбіраюць. З гэтай прычыны пачынаюцца цэлыя бітвы на вуліцах. Забіваюць пры гэтым зусім ніпавінных людзей, якія выпадкова праходзюць. Выслано некалькі броневікоў, якія курсіруюць па Кацярыненскаму каналу каля вуліц і стрэляюць с кулямётаў. Есьць шмат забітых і раненых. Баронючы толькі адзін бровар, было забіто 8 салдатаў, 3 чырвонагвардзейцы і ранено 300 чэлавек. У скляпох знаходзюць шмат утапіўшыхся у гарэлцы.

А пьяныя натоўпы ужо ні здавальняюцца гарэлкай ды грабуюць магазыны.

Слово украінцаў да Крыленко.

У тэлеграмі ад украінцаў да Крыленко паказано, што Крыленко забыў, што гэта—воля народу, свабода і самавызначэнне. Паміж іншым, там ёсьць і аб тым, што Крыленко хоча, каб Украінская Рада была з адных расійскіх большэвікоў, але *народ ні самавызначаюць, а ен сам вызначае сябе.*

Далей украінцы так кажуць:

«Пан Крыленко, ці вы страцілі надзею на мір і хочаця, каб украінцы адны ваевалі с праціўнікам? Чаму вы ні кажаця расійскім садатам, што перад імі стаяць полчышчы немцаў? п. Крыленко, *з вамі будаваць Украінскую Рэспубліку мы ні можам, мы самі яе збудуем.* Вы кажаця аб волі, п. Крыленко, дзе яна? *Цзе воля слова, друку, дзе выбраныя органы усім народам?* Пакажыце нам, мы ні бачым і ні чуем, дзе заседае Устаноўчы Сойм? Ці вам казаць аб волі народу, калі вы разганяеце пасланых ім. П. Крыленко, вы хочаця ісьці на нас, дык памятайце, што дзеля сваёй абароны мы, украінцы, пойдзем на вас. Як старшыня нацыянальнаго блоку арміі паведамляю, што блок арміі з нацыяў: украінскай, эстонскай, польскай, латышскай, жыдоўскай, мусульманскай, беларускай і літоўскай ні прызнаў ўласьці народных камісараў ні лічучы пытання а фронці, а прызнае толькі свой цэнтральны інстытут.»

Старшыня Украінскай Рады 12 арміі Ліокун.

„Да будутъ всѣ едино.“

У уніяцком часопісі «Слово Истины» надрукован артыкул ноўгородзкаго протоіерэя Александра Усьцінскаго аб злучэнні цэркві пад загалоўкам «Да будутъ всѣ едино.»

1) Рымскія каталікі,—кажа аўтор,—і усходнія праваслаўныя хрысьціяне астаюцца у цэльнасьці, кожныя пры сваіх дагматычных верах і пры сваіх літургічных, адміністратыўных і дысцыплінных парадках.

2) Рымскі папа, як ухвалено I і IV ўсесьветнім саборам, прызнаецца главным первосьвяшчэннікам хрысьцян ўсяго сьвету.

3) Імя сьвяцейшаго папы памінаецца на вялікім выходзі і на эктэніях ва ўсіх праваслаўных цэрквах Расійскай дзержавы.

4) Расійская праваслаўная Цэркаў астаецца вольнай, кіруючыся сваімі уласнымі іерархамі.

5) Расійскія праваслаўныя епіскопы, неуздаволяныя рашэннем сваіх спраў сынодам, могуць, як гэта здаралося і у старасьвецкай цэркві, пасылаць апэляцыі да папы.

6) Пазваляецца епіскапам і сьвяшчэннікам адной і другой Цэркві служыць разам Божыю літургію і прычашчацца сьвятых тайн,—у каталіцкай цэркві па каталіцкаму звычаю, у праваслаўнай—-па праваслаўнаму.

7) Так-сама і міране, праваслаўныя маюць право прычашчацца у каталіцкай цэркві, каталікі—у праваслаўнай.

8) Глаўны расійскі мітрапаліт ці патрыарх паведамляе папу а сваім ухваленні паведаміцельнай граматай.

Апошнія навіны.

Украінскія грошы. У Кіеві вышлі украінскія грошы за подпісам дырэктора дзяржаўнаго банку украінскае рэспублікі. Грошы маюць гэтакія напісы: Украінская народная рэспубліка. Дзержаўны крэдытовы білет. Карбованцы раўняюцца расійскім рублям.» Грошы забезпечываюцца усёю дзяржаўнаю маентнасьцю рэспублікі, землямі, лесамі, дзяржаўнымі прыбыткамі, цукроваю монапольяй і іншымі монапольямі і маентнасьцямі. Грошы маюць напісы на расійскай, польскай і жыдоўскай мовах.

Селянскі зьезд пра Украіну і большэвікоў. 7-го сьнежня на селянскім зьездзі у Петраградзі абгаварывалося пытанне пра адносіны «народных камісароў» да Украіны. Была ухвалена такая рэзалюцыя: 1) у той час, як зроблено перамірые на немецкім фронці, абвешчаецца вайна дома, з Украінаю. Гэта злачынство і ганебнае ліцамерство; 2) зьезд выказвае сваё абурэнне радзі народных камісароў, каторая ушчынае новую вайну у расійскай рэспубліцы; 3) зьезд вымагае прыпынення братняй крывавае вайны; 4) зьезд заяўляе, што рада народных камісароў, якая вінна у гэтай братняй вайне, панясе кару перад народам у асобі Устаноўчаго Сойму; 5) зьезд заклікае салдатаў і матросаў ні йці паходам на Украіну; 6) зьезд шле шчырае прывітанне Украінскай Радзі, украінскай радзі работніцкіх і салдацкіх дэпутатаў, якія сталі на абарону Украіны.

Пастанова «Праваслаўнае Цэркоўнае Рады.» Усеукраінская Праваслаўная Цэр-

Тут бацька намерыуся памялом у Івася, нібы зьбіраючыся прабіць яго. Івасеу бацька малявау зьяву бою па-сваему. Івась слухау, раскрыушы рот.

— А ім баліць?— спытау Івась.

— Каму?

— Тым, што гэтак бьюцца.

— Уселяк, сынок, бывае: каго раняць, таму баліць, а на сьмерць забьюць, нічога і ні учуеш.

— А я-б ні біуся.

— Як-то ні біуся-б? Быу бы салдатам, то мусіу бы ваеваць, сынку.

І другія думкі пачыналі варушыцца у галаве Івася. Цяпер яму робіцца крыху ясьней, чаму сярод салдат нападаліся і такія, на чыім твару адбівауся такі смутак і горо. Мусіць есьць с чаго засумаваць, занудзіцца чалавеку! І яшчэ бачыу Івась, як з другога боку, з-за таго нівядомаго лесу, ішлі і другія паяздэ з вагонамі, на каторых былі вялікія, чырвоныя крыжэ. І ціха было у гэтых цягніках, нірухома ляжалі там раняныя салдаты. А маці кожын раз, назіраючы на гэтыя вагоны, цяжка-цяжка уздыхала, прамоуляючы:

— О, Божэ, Божэ! Колькі гіне і глуміцца народу!—

II.

Ад часу да часу любіў малы Івась рабіць абходы сваіх улюблепых куточкау, якіх было тут ні мала. Бывала, раніцою выйдзе Івась з будкі на свой дворык, прыпрэцца дзе-небудзь у куточку на совейку, сьцішыцца, задумаецца, стаць, разважае, прыслухіваецца да тых радасных зыкау і шуму, каторымі жыве гэты вольны Божы сьвет, або проста любуецца хараством летняго дзенька. Нейкое піяснае для самого Івася жаданне пацягне яго далей з двара, на той прастор, дзе натура стварае таемносьць жыцця.

На акраіне поля стаяу тут лес, пачынаючыся чародкаю высокіх і роуных дубоу, каторыя, крыху вотдаль ад залезнай дарогі, злучаліся с таушчэразнымі старасьвецкімі хвоямі. Здавалося, што нейкі лякны цар сумыслу павыбірау іх з усяго лесу: такія сны былі высокія, выносныя, стройныя, гладкія, а маяушы іх—адна любата,—адна у адну, як пышныя шапкі. Далей, каля поля, цягнууся купчасты прысадзісты хвойнік, сярод каторага зрэдка разьнімалі свае прыгожыя верхавіны старыя хвоі. У гэтым хвойніку было много даунейшых ям.

Вучоныя людзі, каторыя хадзілі сюды з гораду пагуляць, пашпацыраваць (горад быу ні так далека), казалі, што гэтыя ямы—знаке глыбокой старыны—гэта даунейшыя акопы, як яшчэ Літва ваевала з Маскоушчыной. Простыя людзі пра ямы гаварылі крыху ні так. Сяляне зацьверджалі, што тут ні так дауно, на памяці многіх з іх, быу бровар, і у гэтых ямах закопывалі картоплю. Івася ні так цікавіла гэта спорка вучоных з нівучонымі, як самы тыя ямы, на грунці каторых глеба ужо заскарынілася, і там расла траука, купкі прыгожаго сіуцу і розныя краскі, у каторых так многа было усякіх конікоу і жучкоу. А самае важнае—каля ям пад купчастымі хвойкамі расло много добрых грыбоу, пра каторыя ведау адзін толькі Івась. І часта малы Івась, узяушы с сабою кошык і лустачку хлеба, прыбегау сюды пагуляць, паглядзець на вежы цэркваў і касьцелоу, каторыя былі адтуль добра відаць, на стары манастыр, самы высокі ва усім горадзі, на трубы фабрык і заводау. Сюды падыходзілі роуненькія загоны жыта і збожынкі, тут жа было многа сьпеву птушынаго, шуму і звону уселякіх мушак і блішчастых жучкоу. І Івась так углыбляуся ва усе гэтыя малюнкі і зьявы, так зьліваўся з жыццем поля, лесу і усяго гэтаго Божаго сьвету, што напэуня быу бліжэй к пазнанню таемнасьці яго жыцця, чым які небудзь вучоны.

Каля ям быу высокі пагорак, с каторага было далека відаць. Івась часта узьбегау сюды, каб паглядзець, што творыцца вакруг.

Было гэта пад восень.

Івась стаяу на пагорку. Ен прыслухівауся к цішы, як бы яна павінна была штось адкрыць яму. Яго чуткое вухо улаўляло далекі-далекі гул, бы гром. Але небо было ясьнюткое, дзе-ні-дзе зьлегінька засьцілалося яно тонкімі косьцілачкамі сьветлых хмарок. А у полі і у лесі было ціха, толькі у гары жаласна пасьвістывау каршун. Сярод гэтай агульнай цішы сьвіст яго быу надта сумны, нівяселы. А гром усе гучау, але раскаты яго былі так глухі і далекі, што толькі чуткае вухо магло разслухаць яго. Івась ні ведау, які гэта гром, але яму было страшна, і нейкая ніясная трывога калыхала яго душу.

Але што гэта? Які гэта гул? Скуль ен? Нічога падобнаго ні чуу Івась. Гул быу густы, магутны і блізкі, але трудна было распазнаць, адкуль ен ішоу. Івась углядауся па бакох, а гул ні пераставау і назойліва лез у вушы. Ускінуушы вочкі у гору, убачыу Івась, як высока над галавою неслася нівядомая пташка. Але дзе есьць такія пташкі? Не, гэта напэуня зьмей. Івася ахопіу страх. Зьмей зрабіу у воздусі круг, крыху спусьціуся на ніз.—Віз-з-зь!—загуло у гары, і зараз жа у бок залезнай дарогі пачууся страшэнны стрэл, бы пярун ляснуу. Зямля здрыганулася, на лесі панеслося, тарарахкаючы, яхо, як бы гэты зьмей рагатау сваім страшным рогатом.

Івась бедны так перапалохауся, што прытуліуся да хвойкі і увесь троссся і калаціуся.

Зноу запішчало штось у воздусі. Івась мімавольна закрыу ручкамі твар і чакау. Другі гук быу яшчэ грамчэйшы, яшчэ злосьней затарарахкау лес, і чорны густы дым паваліу ад будкі.

С плачам кінууся Івась да дому. Будка была ужо уся ахвачана полымьем, агнявістыя языкі лізалі яе дах, шугалі праз вокны і, як вужакі, віліся па сьценах...

А дзе ж ен сам, гэты сторож? Чаму ні відаць мацяры? Дзе яны? Чаму ні ратуюць свайго набытку?

— Мама, мамачка! Тата!— загаласіу Івась заламаушы ручкі. Але ні маці, ні бацька ні вышлі на яго жалобныя прычытанні.

— А Божэ-ж мой, Божэчка!— галасіу нішчасны хлопчык, з вялікаго гора упаў ен на зямлю, біуся аб яе і грыз сыры пясок. І ніхто ні адазвауся на яго вялікае горо, адзін толькі разложысты дуб з асмаленым камлем і лісьцям пазірау так горка і пакутна, як бы яму было блізка ні толькі свае нішчасьце, але і нішчасьце гэтаго беднаго сіроткі.

Тарас Гушча.

коўная Рада пастанавіла абьявіць Украінскай Праваслаўнай Царкві, каб у царквах Украіны на службах Божых памінаць толькі: «Багалюбівую і Богахранімую Дзяржаву Украінскую, яе вышэйшую уладу, Усеукраінскую Царкоўную Раду і усё украінскае войско.»

Газэта «Гроза.» Посьля доўгаго перапынку, выйшла зноў чорнасоценная газэта «Гроза.» Газэта піша, што большэвікі выявілі сябе больш істінно-рускімі, як генэралы Алексееў, Рузскі і Каледзін.—«Ці доўга працягнецца улада большэвікоў,--піша газэта,--ні ведамо, але самодзяржавіе ужо маемо. Цар блізка.»

Пагражаюць гільотынаю. На пасядзэньні петраградзкае рады выступіў Троцкі, які у сваёй прамові сказаў, што рэвалюцыйная улада ні задумаецца паставіць на Дворцовай плошчы гільотыну. Ад імені левых с.-р. выступіў Фішман. Ен сказаў: ніхай Ленін і Троцкі, каторыя уяўляюць с сябе Маратаў і Робеспвораў, ні забываюць пра тое, як скончылі жыцце яны і што было посьля іх сьмерці.

25-я гадаўшчына P. P. S.

(Польскай Партыі Соцыялістычнай).

У сьнежні 1917 году споўнілася 25 гадоў ад тэй пары, калі зложылася і начала сваю працу Польская Соцыялістычная Партыя [P. P. S.] Пачатак партыі быў паложаны на зьездзі польскіх соцыялістычных дзеячоў у Парыжу у лістападзі 1892 году аснаваннем Зьвязку заграпічнаго Соцыялістаў Польскіх, каторы у лютым 1893 году злучыўшыся з «Пролетарыятчыкамі» і стварыў P. P. S. Ад самаго сваіго начатку гэта партыя стаяла на чале работніцкаго руху у Польшчы, разшырыўшы сваю чыннасьць на усе тры, так званыя, «заборы»—часткі адыйшоўшыя да Расіі, Прус і Аўстрыі.

Асабліва вялікія заслугі перад польскім пролетарыятам мае партыя за сваё змаганне з уладаю рускаго царызму у Польшчы. Яна першая выразна ўстала за нізалежнасьць Польшчы, разумеючы, што толькі способ арганізацыі пролетарыяту у абмежках уласнай нацыі можа прывясьці да найлепшых скуткаў. Найбольш сільнай партыя была у 1904—1908 годах, налічаючы ў сваіх радах дзесяткі тысячаў членаў.

Праца P. P. S. была ні саўсім чужою і для нас, беларусаў. Шмат-хто, асабліва с першых яе працоўнікоў, быў родам з нашаго краю. У Вільні заўсёды была арганізацыя P. P. S, і выходзіў партыйны орган, і ў ёй жа адбыўся III зьезд партыі. Яе працай быў паложаны пачатак беларускаго соцыялістычнаго руху, бо працуючы сярод нашаго работніцтва і селянства партыя старалася разбудзіць у іх нацыянальнае самапачуцце. Гэта рабілося як на моцы пастановы III зьезду «каб у стасунках с проціў-урадовымі групамі другіх народаў... старацца будзіць у іх сэпаратыстычныя бажанні» для супольнаго здужання царызму, так і дзеля таго, што многіе члены P. P. S.—беларусы, толькі у яе радах пачаўшы працу, задумаўшыся мо у першы раз над нацыянальным пытаннем, пачулі і пазналі хто яны такія.

Частка гэтых, у лоне P. P. S. пазнаўшых сябе соцыялістаў, увайшла потым у склад тых дзеячоў каторымі заложана была першая беларуская соцыялістычная партыя «Беларуская Соцыялістычная Грамада.»

Цяпер польскі народ стаіць перад новым нішчасьцем. Сьветлая думка яго аб залечаным целі, аб злучаным народзе, гатова зацьміцца. Міжнародныя шахраі што момэнт гатовы абкроіць яе так, як ім будзе выгодней і кінуць на шалькі як вымушаную справядлівасьцю прывеску. Цяпер, як ніколі болей, польскай дэмакратыі патрэбны шчырыя і усім жыццем сваім ёй атданыя сыны. Іх, гэтых праўдзівых сыноў народу лучыць партыя P. P. S.

Набажаем жа ёй сілы і ніуломнасьці на яе пачэсным шляху.

А. Прушынскі.

Протэст.

Мінская Беларуская Гучнеўская Грамада, як нацыянальная арганізацыя няў-беларусаў, пратэстуе проці зачыненпя Усебеларускаго Зьезду праз Раду «народных» Камісараў Заходняго Фронту і Обласьці. Маладое пакаленне ні забудзе гэтаго паскуднаго гвалту над народам, які дамагаецца самавызначэння і запляміць пагардаю людзей, каторыя робяць напоперак сваім лёзунгам.

Прэзыдыум Грамады
Старшыня Т. Назарэнко
Сябрэ старшыні { П. Міцкевіч. М. Романовіч.
Казначэй Т. Кіркевіч.
Сэкрэтарэ. { В. Александраў. Т. Калітоуская.

ДА БЕЛАРУСІ.

Працуй, Беларусь,
На хвалу ля людзей
Кажы, Беларусь,
Сваю прауду сьмялей;
Удар, Беларусь,
У вечавы гулкі звон.

Узгары, Беларусь,
Свой забыты загон.
Гэй, скінь, Беларусь,
Ярмо цьмы прошлых лет!
Жыві, Беларусь,
Каб жылі: *воля, сьвет!*

Л. Родзевіч.

САЛДАЦКАЯ ПЕСЬНЯ.

Я салдат малады,
Я дзяцюк, хоць куды,
І без меры я дуж.
Звäць мяне—беларус.
Эх, як стане у рад
Малайцоу гэткіх шмат!
Усе вольны яны—
Беларусі сыны.
Дык як станyць, пайдуць,—
Дзе стоги, крыуда жывуць,

Кажы сьмела тады:
Больш ні будзе бяды!
Гэй, салдацкая моц,
І у дзень, і у ноч
На старожы ты будзь,
Каб ісьці, дзе стогн чуць!
Хай з салдацкіх грудзей
Па зямельцы усей
Сказ імчыць, як стрэла:
«Беларусі хвала!»

Л. Родзевіч.

Статут Гуртка Старыцкай моладзі.

Жыва мова—жыве народ!

1). Усе сябрукі гуртка павінны высока дзяржаць свой беларускі гонар: мы маем выдатную гісторычную мінуушчыну і слаўную будучыну.

2). Шырыць свядомасьць між братоу беларусаў: знаеміць з гісторыей Бацькаушчыны, роднай літэратурай, нашымі патрэбамі і жаданнямі.

3). Падтрымоуваць еднасьць з суседнімі гурткамі, каб весьці супольную працу дзеля адраджэння роднаго краю.

5) Клікаць у гурток усіх сьвядомых беларусаў дзеля працы на родным грунце.

5). Кожын сябрук гуртка павінен далажыць старання дапамагчы сьвядомым беларусам злучыцца у гурток.

6). Усе сябрукі гуртка павінны гаварыць між сабою і усюды толькі па-беларуску; выпісваць беларускія газэты, часопісы і кніжкі, якія выйходзяць на роднай мове і шырыць беларускую літэратуру.

У гурток злучыліся: Янка Паулюкау Колпак, Алесь Міхалау Колпак, Адам Міхалау Бабарэка, Алесь Юркау Аніхоускі, Янка Янкау Бельмач, Петра Антосяу Зенюк, Уладзімір Паулюкоу Колпак, Автось Якімау Астрэпка, Адам Антосяу Бабарэка, Дзеніс Віктарау Клюйка, Стэпан Васілеу Верабей і Уладзімір Тодарау Мазаляка.

Старшынею гуртка абабралі Алеся Міхалава Колпака, памоцнікам старшыні—Петру Антосеваго Зенюка, пісарам—Алеся Юркаваго Аніхоускага.

14 сьнежня 1917 г.
С. Старыца, Слуцкаго п., Мінскай губ.

Зьезд воінаў-беларусаў паўдз.-заход. фронту у г. Кіеві.

17-го сьнежня г. р. адчыніўся першы зьезд воінаў-беларусаў паўдз.-заход. фронту у г. Кіеві. Цікава было бачыць, з якімі палітычнымі паглядамі зьявіліся акопнікі на зьезд. Ні ведаючы амаль што нічога пра беларускі рух і нават ворага настроеныя проці яго, бачучы у ім чуць ні сэпаратызм і т. п. попалахі. Але зразу кідалося у вочы, што якога бы палітычнаго пагляду ні былі прыехаўшыя на зьезд, відаць было, што у кожнаго балела душа аб долі Беларусі і моцнае жаданне памагчы ёй. І вось, як толькі яны азнаёміліся з ідэяй беларускаго адраджэння, тлумачылі, дзеля чаго нам патрэбна ўзяць справу Беларусі у свае рукі і кожны рабіўся шчырым прыхільнікам беларускаго руху. І можна наперад сказаць, што зьезд пройдзе добра і зробіць многа карысьці дзеля беларускае ідэі.

Старшынёю зьезду выбраны сяб. Краскоўскі. Перш, чым разгледзяць зьмест зьезду, ўносіцца прапазіцыя прасіць агульнабеларускі зьезд у Мінску, каб ён зараз жа паслаў прэдстаўніка ад беларускаго народу на мірную канфэрэнцыю, с чым усе згоджаюцца і ухваляецца такая рэзолюцыя: «Вайсковы беларускі зьезд п.-з. фронту на сам перш абмяркаваўшы пытанне аб перагаворах па заміренню пастанавіў: зьвярнуцца да ўсебеларускаго зьезду з дамаганнеу, перадаючы наслаць ад Нац. Бел. Краёв. Уласьці прэдстаўніка на мірную канфэрэнцыю дзеля абароны праў Беларусі, яе нізалежнасьці і цэласьці.»

Пасьля ідуць даклады з мейсц, з якіх выяўляецца моцнае жаданне ўсіх беларусаў арганізавацца дзеля абароны сваіх беларускіх інтэрэсаў, патрэба аўтаноміі Беларусі, арганізацыі беларускіх войск, каб бараніць сваю старонку ад безладдзя і інш.

Адно можна было бачыць, што загаварыла у беларуса нацыянальнае пачуцце і стыхійная сіла беларускаго руху зломіць усе перашкоды, якія будуць яму ставіцца на яго шляху.

Далей, на чарзе пытанне аб цяперашнім і будучым становішчу Беларусі. З дакладам па гэтаму пытанню выходзіць сябар Леўшчэнко. Выказаўшы пра бышую нізалежнасьць і нацыянальны росквіт Беларусі у часі Вел. Княж. Літ.—Рус., ен добра паказаў ўсе тые варункі, якія валтузілі беларускую нацыянальнасьць і беларускую культуру і якім чынам дайшла Беларусь да цяперашняго становішча. Свой даклад сяб. Леўшчэнко канчае поклічам да ўсіх беларусаў бараніць право Беларусі. Зьезд шчыра вітае дакладчыка і дзякуе за працу. Чарга прамоўцаў у адзін голас заяўляе, што даволі апекаваць беларуса, што ён сам патрапіць зрабіць у сваёй хаці парадак. Дзеля гэтаго канечная патрэба зараз жа утварыць краевую Бел. Нар. Уласьць. Прапануецца паслать тэлегр. агульна беларускаму зьезду каб ён абьявіў Бел. Народ. Рэспубліку.

З дакладам аб беларускім нацыянальным адраджэнні, беларускай літэратуты і мове выходзіць сяб. Фарботко. Яго даклад робіць моцнае уражэнне на ўсіх, накасываючы тую вялікую барацьбу лепшых сыноў Беларусі за беларускую культуру, мову і патрэбы Беларусі. У творах вядомых беларускіх пісьменнікаў як Марцінкевіч, Неслухоўскі, Богушэвіч, Я. Купала, Я Колас, А. Гарун, М. Богдановіч і друг. чуецца крык пакрыўджанаго цяжка беларуса, яго цяжкая доля, безпраўнае жыцце. Але вітае і надзея на лепшую долю. Як і першаго дакладчыка, сяб. Фарботко шчыра і доўга вітае увесь зьезд.

20/XII 17 г. г. Кіеу. П—скій.

Беларускі тэатр.

«Апошняе спатканне» драма у 4-х дзеях Галубка.

Беларускі тэатр у апошнім часі прыдбаў колькі новых цэнных, бо арыгінальных, сцэнічных твораў. Досыць успомніць «Раскіданае гнядзо» Янкі Купалы, ды нідаўна надрукаваныя творы Тараса Гушчы «Антось Лата» і «На дарозі жыцця».

Каб прывітаць членаў усебеларускаго зьезду, 14-го сьнежня у Мінскім гарадз. тэатры быў пастаўлены новы сцэнічны твор В. Галубка: «Апошняе спатканне», драма у 4-х дзеях.

Новы сцэнічны твор узбагачывае арыгінальную беларускую тэатральную літэратуру яшчэ аднэй драмай.

Зьмест драмы такі: Селянін мае двох сыноў: старшаго, мацнейшаго, прызначыў для гаспадаркі; малодшаго, слабейшаго здароўям, аддаў у навуку. Вось малодшы сын, гарачая, сьветлая, добрая натура, скончыўшы гімназыю, маніцца паехаць вучыцца яшчэ вышэй і больш, каб быць пацехай на старасьць сваім бацьком.

Ен і пакідае сваіх бацькоў, каторыя галосяць, бытцам бы прадчуваючы, што іх сын загіне. У вышэйшай школі іх малодшы сын працуе падчас палітычнаго руху 1905 году, з гарачай верай у сьветлую шчасьлівую будучыну працоўнаго народу, ідзе ваеваць з насільствам царскіх слуг, на гвалт адказывае гвалтам, застрэліўшы тырана, які зьдзекаваўся над народам,—і арыштаваны, пападае у царскі вастрог. Там ён церпіць і мучыцца думкай, што яго ахвяра ні памагла, што сонцо свабоды ні скора заяснея; успомінае сваіх бедных бацькоў, сваю нішчасную цяжкую моладасьць, нарэшці, калі прыходзяць і чытаюць яму і яго таварышам прыгавор на сьмерць, устрапянуўшыся, пачынае узмацоўваць дух сваім сябром ды раіць ім спакойна і сьмела глянуць у вочы сьмерці. Скончыўшы свае словы, углядаецца у нейкі добра знаёмы яму твар селяніна, каторага прывялі так сама на сьмертную кару і, калі прачыталі у прыгаворы на сьмерць прозвішчо яго старэйшаго брата, раптоўна кідаецца яму на шыю, цалуе яго і ад ніспадзеванай болі душы і сэрца, падае мёртвы.

Пасьля драмы былі дэклямацыі, сьпеўкі ды танцы.

Дэклямавалі артысты: малыя дзеткі ад 8-мі гадоў і старшыя людзі. Дэклямацыя наогул выйшла надта добра, падбор вершаў быў старанны і цікавы. Запратэставаць толькі трэба проціў артысты, які стаў зьдзекавацца (бо хіба толькі так назваць можна) над апавяданнем Ядвігіна Ш. «З маленькім білецікам». Так перакруціць, папсаваць твор пісьменніка,—праўдзівы артыста асьмеліцца ні павінен.

Сьпеўкі мала прыпаміналі беларускія народныя песьні. Відаць было, што адно толькі словы беларускія—мэлёдыя ж украінская або вялікаруская. Рэпэртуар беларускаго хору у Вільні быў і лепшы і цікавейшы з артыстычнаго боку. Ці ні можна бы яго увясьці у нас?

Найгорш выйшлі танцы. Ані параўняць іх з танцамі, якія мы бачылі у беларускім тэатры нябошчыка Ігната Буйніцкаго. Такога артысты-танцора мы, мусі быць, ужо і ні спаткаем! А гдзе і калі давядзецца яшчэ пабачыць нам беларускія танцы: «мяцеліцу», «гневашa», «круцеля», «мельніка», «таўкачыкі», «цярэшку», «падушачку»? Няўжо-ж гэта ўсё з нябошчыкам Ігнатам Буйніцкім зыйшло у магілу?

Ромуальд Земкевіч.

«Апошняе спатканне.»

У Мінскім гарадзкім тэатру 14-го сьнежня адбыўся беларускі спэктакль. Ставілі «Апошняе спатканне» В. Галубка.

Дзіўна нікаторыя «драматургі» і «артысты» глядзяць на тэатр наогул і на беларускі тэатр асобіста. Ім здаецца, што драму можна сасьцёбаць экспромтам,—сеў, напісаў і—гатова! Ім здаецца, што любому чэлавеку з вуліцы можна зрабіцца артыстам. Надзеў львіную скуру і паказывай у цырку льва. Ім здаецца, што гэроі беларускай драмы павінны гаварыць вульгарна, што называецца «па мужыцку.»—Гэта называецца малеваць праўдзівае жыцце. Ім здаецца, што да кожнаго беларускаго драматычнаго твору, як масло да хлеба, трэба дадаць сьпевы, і слабенькі хор павінен,—ні к селу, ні к гораду,—сьпеваць, дзе трэба і дзе ні трэба.

Што датыча «Апошняго спаткання», то узяць гэты твор у рамкі крытыкі—нельга. Німа ні драматычнаго наросту, ні ігры. Ад гэтай драмы, як шкілет, астаецца толькі адзін голы сюжэт, праўда, ужо зьбіты, але, ведаючы тэхніку тэатральную, і маючы літэрацкае пачуцце, можна было-б апрацоваць болей-меней ні што сабе рэч.

Ці ведаеце вы, «дзеці Апалонавы» што тэатр гэта палац штукарства, харавства, натхнення і найвышэйшая асалода для душы?

Трэба быць дастойным і асьцярожным жрэцом ў гэтым сьвятым хорамі.

Тым болей, беларускі тэатр павінен быць акрысталізованым чыстатой этыкі, штукарства і мовы. Ен яшчэ дужа малады і яго паганіць рознымі вульгарнымі выразамі, балаганнымі рэчамі, як кавалкі з «Апошняго спаткання», як «Забыўся падперазацца», ці дэклямацыя «З маленькім білецікам»—яшчэ рана.

Раней дайце беларускаму тэатру клясычнае афарбаванне, а потым, с часам, дзеля спэцыяльных ахвотнікаў, прыдуць і балаганы, і шантаны і розныя кіно-выкрутасы.

Ніхай спэктаклі, ні адказываючыя усяму вышэй сказанному, стануць у нас «апошнім спатканнем». А праўдзівы беларускі тэатр будзе,—мы у гэтым пэўны.

С—к.

Рэдактар Я. Лёсік.

Выдавецтва «Т-во Беларускай Культуры.» Друкарня Я. А. Грынблята.

15Н 11124